OSTIS-2012
(Open Semantic Technologies for Intelligent Systems)

**УДК 004.82:004.55:007.52**

# ФАРМАЛІЗАЦЫЯ СЕМАНТЫКІ ПРАГМАТЫЧНЫХ ФРАЗЕМ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Кім Ю. А., Елісеева В. Я.

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**6rikim@gmail.com**

**olae@open.by**

У працы разглядаюцца прагматэмы беларускай мовы і ажыццяўляецца апісанне семантыкі іх ужывання ў канкрэтных сітуацыях. Такія апісанні плануецца выкарыстоўваць у якасці асновы для стварэння базы ведаў прагматэм беларускай мовы. База ведаў, у сваю чаргу, можа з'яўляцца ядром сістэм машыннага перакладу, семантычнага пошуку і вывучэння мовы, а таксама корпусаў тэкстаў.
**Ключавыя словы:** прагматэма, прагматычная фразема, сітуацыя ўжывання.

## УВОДЗІНЫ

У паўсядзённым жыцці, у працэсе камунікацыі ў межах канкрэтных сфер дзейнасці людзі выкарыстоўваюць дастаткова абмежаваны набор моўных сродкаў. Значную частку гэтага набору складаюць так званыя прагматэмы – устойлівыя выразы ці часткі выразаў, якія ўжываюцца звычайна як адно цэлае ў пэўнай моўнай сітуацыі.

У працэсе камунікацыі чалавек пераўтварае наяўную інфармацыю ў моўныя выразы, якія выконваюць у дадзенай сітуацыі пэўную функцыю, дасягаюць пэўнай мэты. Дзякуючы такой уласцівасці, як сінанімічнасць моўных сродкаў, для адной і той жа функцыі можна пабудаваць больш за адзін эквівалентны сказ. У некаторых выпадках, хаця пабудаванне сінанімічнага сказа цалкам магчыма, выкарыстоўваецца амаль выключна адзін варыянт. Гэта можна назіраць, напрыклад, у вобласці фразеалогіі.

Вядома, што ў працэсе маўлення (сінтэза тэкстаў) чалавек мысліць не асобнымі словамі, а цэлымі выразамі. Менавіта гэтыя выразы з'яўляюцца асновай валодання мовай. У розных выпадках і сітуцыях чалавек выкарыстоўвае нейкую частку з агульнага мноства знаёмых і зразумелых для яго выразаў ці іх частак.

Мэтай дадзенай працы яўляецца вызначэнне, сістэматызацыя і семантычнае апісанне мноства пазначаных прагматэм, уключаючы сітуацыі іх ужывання. На думку аўтараў гэта дазволіць стварыць базу ведаў той часткі беларускай мовы, якая ўяўляе сабой аснову паўсядзённай камунікацыі ў той ці іншай сферы чалавечай дзейнасці.

## 1. Асноўныя азначэнні і актуальнасць даследвання

**Прагматэмы** – моўныя выказванні даўжынёй ад аднаго слова да некалькіх сказаў, кампазіцыянальныя на семантычным і сінтаксічным узроўні, узнаўляльныя як цэлае ў пэўнай аднаўляльнай сітуацыі. Гэта азначэнне, як і вылучэнне саміх прагматэм у асобны клас належыць тэорыі Сэнс-Тэкст (ТСТ) І. Мельчука [Мельчук, 2006, 2007].

Кампазіцыянальнасць адрознівае прагматэмы ад іншых тыпаў фразем, якія з'яўляюцца некампазіцыянальнымі на выключна семантычным (калакацыі: *праводзіць аперацыю*, *прывесці ў адчай*; ідыёмы: *марскі вожык*) ці сінтаксічным і семантычным (*біць лынды*) узроўні. Узнаўляльнасць у выніку канвенцыяналізацыі [Morgan, pp. 261 – 280] адрознівае прагматэмы ад свабодных словазлучэнняў. Нарэшце, нельга блытаць прагматэмы з клішэ, бо прагматэмы ўжываюцца ў адной або некалькіх блізкіх, даволі дакладна вызначаных сітуацыях (*Асцярожна, дзверы зачыняюцца*), а сітуацыя ўжывання клішэ занадта генералізаваная (*Лепш позна, чым ніколі*).

Прагматычныя фраземы, або прагматэмы – устойлівыя і ўзнаўляльныя выразы, і гэта аб'ядноўвае іх з астатнімі фразеалагічнымі

Библиотека БГУИР

адзінкамі. Адрознівае ж іх ад астатніх механізм фразеалагізацыі: яна адбываецца паміж інфармацыяй (сэнсам, глыбінным зместам, або канцэптуальным прадстаўленнем у тэрмінах ТСТ) і яе семантычным прадстаўленнем пад уплывам сітуацыі маўлення (камунікатыўнай сітуацыі), з якой адпаведны выраз непарыўна звязаны.

Структурнай асаблівасцю прагматэм яўляецца тое, што яны маюць даўжыню ад аднаго слова да некалькіх сказаў. Гэта значна ўскладняе працэс выяўлення прагматэм у тэкстах. Таму, напрыклад, пры перакладзе тэкстаў так неабходна абапірацца непасрэдна на семантычны аналіз і ўлік сэнсу не толькі асобных слоў ці нават выразаў, а усяго пазатэкставага кантэксту апісанай у тэксце сітуацыі.

Графічна прагматэмы нярэдка маюць асаблівае афармленне (*Смачна есці* на сурвэтцы, *Паркоўка забаронена* з адпаведным сімвалам і г.д.). Таму ў базе ведаў, якую мы ствараем, плануецца змяшчаць таксама адпаведныя ілюстрацыйныя прыклады. Пры апісанні семантыкі сітуацыі такія выпадкі таксама павінны быць пазначаны.

Варта адзначыць, што прагматэмы як асобны тып фразем многімі фразеолагамі не вылучаюцца асобна. Адна з прычын гэтага – непрыняцце імі погляду на мову як на трансфармацыйны механізм, як гэта мае месца ў тэорыі Сэнс – Тэкст. Нават тыя навукоўцы, што ўлічваюць у сваіх працах па фразеалогіі прагматычны аспект, выдзяляюць толькі частку тых выразаў, якія належаць да прагматэм. Між тым, вылучэнне прагматычных фразем у максімальна шырокім сэнсе, іх збор, класіфікацыя і апісанне на розных мовах з’яўляюцца адной з надзённых задач у сферы лінгвадыдактыкі і перакладу (асабліва аўтаматызаванага і аўтаматычнага). У гэтай сувязі прадметам нашага даследавання з’яўляецца прадстаўленасць і спецыфіка прагматычных фразем у беларускай мове.

Прадстаўленае даследаванне з’яўляецца, на нашу думку, досыць актуальным, бо ва ўмовах, калі беларуская мова задзейнічана ў сістэмах аўтаматычнага перакладу, калі вядзецца падрыхтоўка да стварэння беларускага модуля пераўтварэння тэкст у голас, своечасовы ўлік і апісанне такіх адзінак як прагматэмы не саступае па надзённасці апрацоўцы лексічнага матэрыялу, бо пераклад дадзеных выразаў павінен ажыццяўляцца не праз дэ- і рэканструкцыю, а праз эквіваленты. Нельга забывацца і на тое, што многія прагматэмы ўваходзяць у склад самых частаўжывальных выразаў, якія трэба ведаць на памяць для паспяховай камунікацыі на адпаведнай мове. Размоўнікі і падручнікі для іншамоўных навучэнцаў – першы тып выданняў, у якіх трэба ўдасканаліць разгляд прагматэм; другі тып – падручнікі па беларускай мове для рускамоўных навучэнцаў, якія, дзякуючы больш уважліваму разгляду прагматэм, павінны даць чытачу магчымасць пазбавіцца ад празмернага ліку калек, якія засмечваюць яго маўленне.

Уключэнне беларускага слоўніка прагматэм у шматмоўную базу дазволіць пашырыць эмпірычную базу для далейшага ўдасканалення тэорыі прагматэм. Такая база з’явіцца каштоўным рэсурсам для параўнальнага мовазнаўства, лінгвакраязнаўства і, магчыма, псіхалінгвістыкі.

Трэба таксама адзначыць, што ў параўнанні з іншымі мовамі (напрыклад, рускай ці французскай), склад беларускіх прагматэм значна бяднейшы. Гэта абумоўлена слабай прадстаўленасцю самой беларускай мовы ў многіх сферах грамадскага жыцця. Але ўлік гэтай акалічнасці пры стварэнні базы ведаў прагматэм, на наш погляд, павінен даць дадатковую глебу для далейшага развіцця беларускай мовы ва ўмовах яе сучаснага сутыкнення с іншымі, больш развітымі мовамі.

## 2. Класіфікацыя прагматычных сітуацый і падыходы да іх фармалізацыі

### 2.1. Класіфікацыя прагматэм і сітуацый іх ужывання

Намі былі вылучаны тэматычныя групы прагматэм паводле таго, да якой вобласці належыць сітуацыя камунікацыі той ці іншай прагматычнай фраземы. Прывядзем тут прыклады некаторых такіх сітуацый з іх нефармальным апісаннем.

На малюнках 1 і 2 прыведзена першапачатковая класіфікацыя сітуацый ужывання прагматэм. Усе сітуацыі ўжывання прагматэм падзелены на 2 вялікія класы: месца ўжывання ў мове і месца ўжывання ў жыцці. Мноствы прагматэм абодвух гэтых классаў цалкам супадаюць, бо дадзены падзел зроблены ў мэтах атрымання больш дасканалай інфармацыі адносна кожнай прагматэмы ў прыкладным аспекце, напрыклад, для выкарыстання пры перакладах ці ў вывучэнні мовы. Відавочна, што дадзеная класіфікацыя не поўная і будзе ўдакладняцца. Напрыклад, жыццёвых сфер ужывання прагматэм значна больш, чым адлюстравана на малюнку.

Варта адзначыць, што назвы некаторых выдзеленых падкласаў сітуацый з розных класаў супадаюць (гл. мал.1). Гэта не выпадкова, бо, напрыклад, адны і тыя ж формулы ветлівасці могуць ужывацца як у вуснай, так і ў пісьмовай формах. Але ў кожным з выдзеленых падкласаў могуць сустракацца і тыя прагматэмы, якія не супадаюць. Інакш кажучы, мноства прагматэм прывітанняў з класу “Формулы ветлівасці” для вуснай размовы, напрыклад, не супадае цалкам з мноствам прывітанняў у пісьмовых тэкстах, але перасячэнне гэтых мностваў не пуста. Таксама ж зразумела, што ёсць пэўныя адрозненні паміж афіцыйнай і прыватнай перапіскай.

Бібліятэка БДУІР

Месца ўжывання ў мове

- Вусная размова
  - Формулы ветлівасці
    - Прывітанні
    - Развітанні
    - Падзякі
    - Пажаданні
    - Звароты
  - Віншаванні
  - Каманды
- Пісьмовыя тэксты
  - Афіцыйныя дакументы
  - Афіцыйная перапіска
    - Пратакольныя кампліменты
  - Асабістая перапіска
    - Прывітанні
    - Развітанні
    - Падзякі
    - Пажаданні
    - Звароты
    - Віншаванні
  - Этыкеткі тавараў
  - Інфармацыйныя надпісы
    - Папярэджанні
    - Загады
    - Забароны
    - Паведамленні
    - Звароты
    - Удакладненні
  - Інтэрфейс камп’ютарных сістэм

Малюнак 1 – Класіфікацыя сітуацый ужывання прагматэм па месцы ўжывання ў мове

Месца ўжывання ў жыцці

- Агульнаўжывальныя
- У транспарце
  - Агульныя
  - У наземным транспарце
  - У падземным транспарце
  - Авія
- На вуліцы
- На спажывецкіх таварах
- У спорце
- Вайсковыя
- У грамадскіх месцах
- У памяшканнях і ўстановах
  - Агульныя
  - У судзе
  - У медычнай установе
  - На пошце
  - У магазіне

Малюнак 2 – Класіфікацыя сітуацый ужывання прагматэм па месцу ўжывання ў жыцці

## 2.2. Мноствы і першапачатковае апісанне прагматэм

Разгледзем далей прыклады пэўных прагматэм і семантычныя асаблівасці адпаведных ім сітуацый ужывання.

Намі вылучаны і аднесены да класу **прывітанняў** наступныя прагматэмы:

“*Дзень добры!*”, “*Добры дзень!*”, “*Добрай раніцы!*”, “*Добры вечар!*”, “*Прывітанне!*“, “*Вітаю!*”. Усе пералічаныя прагматычныя фраземы ўжываюцца як у вуснай, так і ў пісьмовай формах.

Па месцы ўжывання ў жыцці іх можна аднесці да агульнаўжывальных, бо ў любой сферы чалавечай дзейнасці ёсць месца для прывітанняў. Дадзеныя прагматэмы, адзначым, маюць семантычныя адрозненні. Так, фразема “*Добры дзень!*” з’яўляецца найбольш распаўсюджанай і універсальнай, ужываецца як у афіцыйных сітуацыях, так і ў неафіцыйных. Крыху меньш ужывальная падобная да яе прагматэма “*Дзень добры!*”. Звычайна яна ўжываецца ў адказ на прывітанне суразмоўцы ці з мэтай павышэння афіцыйнасці камунікацыі.

Менш афіцыйныя формы прывітанняў – “*Прывітанне!*” і “*Вітаю!*”. Звычайна яны ўжываюцца паміж сябрамі ці добра знаёмымі людзьмі, але не забараняецца іх ужыванне і пры звароце да незнаёмых. Дадзеныя формы прадугледжваюць таксама сінтаксічныя варыянты зваротаў да адной ці некалькіх асоб: “*Прывітанне, …!*”, “*Прывітанне, сябры!*” і інш., але *“…, вітаю!*” – звычайна ў звароце да адной даволі знаёмай асобы ці сябра.

Прагматэмы “*Добрай раніцы!*” і “*Добры вечар!*” наўпрост суадносяцца з пэўным часам сутак. Відавочна, што іх немагчыма ўжываць удзень. У адрозненне ад іх прагматэмы “*Добры дзень!*” і “*Дзень добры!*” могуць ўжывацца ў любы час сутак. Аб’ядноўвае прыведезныя чатыры фраземы слова “*добры*”, якое традыцыйна ўжываецца ва ўсіх выпадках з мэтай ветлівага пажадання субяседніку дабра, добрага настрою і г.д.

На малюнку 3 прыведзена дрэва сінтаксічнага падпарадкавання для фразем “*Добры дзень!*” і “*Дзень добры!*”, якія на паверхневым сінтаксічным узроўні маюць розны выгляд.




Малюнак 3 – Дрэва сінтаксічнага падпарадкавання прагматэмы

На малюнку 4 прыведзена схематычная паўфармальнае апісанне семантыкі ўжывання прагматэмы “*Добры дзень!*”. На гэтым жа малюнку адлюстравана суаднясенне дадзенай фраземы да пэўных класаў, вызначаных на мал.1, 2.

Бібліятэка БГУІР




На малюнку 4 бачна, што прагматэма "*Добры дзень!*" з'ўляецца першай фразай камунікатыўнага акту паміж двума суб'ектамі – чалавекам і чалавекам, якія могуць "абменьвацца" адной і той жа прыведзенай фразай. Фразема ўжываецца амаль ў любы час сутак з мэтай пажадання добрага настрою. Да гэтага апісання можа быцьададзена спасылка на тое, што 2-гі суб'ект камунікацыі ў адказ на прывітанне 1-га суб'екта можа выкарыстаць іншую фразему з разгледзенага вышэй мноства.

Аналагічным чынам у прадстаўленай працы апісваюцца ўсе вызначаныя прагматэмы. Пасля ўдакладнення класіфікацыі і паўфармальнага семантычнага апісання сітуацый ужывання прагматэм плануецца абагульніць выкарыстаныя моўныя сродкі апісання семантыкі з мэтай павышэння ўзроўню фармальнасці і прыгоднасці да далейшага практычнага прымянення.

Разгледзім прыклады прагматэм з іншых класаў.

У якасці **развітанняў** вызначаны наступныя: "*Да сустрэчы!*", "*Да хуткай сустрэчы!*", "*Да хуткага спаткання!*", "*Пакуль!*", "*Абдымаю!*", "*Цалую!*", "*З павагай, ...*", "*Дабранач!*", "*Добрай ночы!*". У гэтым мностве прагматэм таксама выдзяляюцца тыя, якія ўжываюцца ў любых выпадках (універсальныя) ці ў афіцыйных абставінах (афіцыйныя), якія можна ўжываць толькі неафіцыйна і ў ніякім выпадку – у працэсе камунікацыі афіцыйных асоб (напрыклад, "*Пакуль!*"), а таксама асабістыя – тыя, якія дарэчы ў стасунках толькі паміж вельмі блізкімі асобамі. Таксама ж як прывітанні, развітанні выкарыстоўваюцца паміж дзвюма асобамі, якія ўзаемна абменьваюцца дадзенымі фразамі з мажлівасцю сінанімічных падменаў.

З разгледжаных вышэй прагматычных фразем прывітаннаў і развітанняў можна зрабіць выснову, што пры апісанні семантыкі сітуацый ужывання формул ветлівасці варта звяртаць увагу на адпаведную мадэль камунікацыі, якая змяшчае характарыстыкі ўдзельнікаў камунікацыі, а таксама час, месца і форму камунікацыі (вусная ці пісьмовая).

У дадатак ці замест развітанняў, напрыклад, напрыканцы афіцыйнага дыпламатычнага ліста ўводзяцца **пратакольныя кампліменты**, якія ў агульнапрынятай форме выражаюць павагу да адрасата. Ступень ветлівасці залежыць ад вышыні пасады апошняга. Так, у лісце да міністра, намесніка міністра, дырэктара дэпартамента МЗС (мае ранг надзвычайнага і паўнамоцнага пасла, альбо роўны яму ранг), сенатара, губернатара, пасла, пасланніка, былых міністра, пасла ці сенатара прынята пісаць "*Запэўніванне ў вельмі высокай павазе*". Намесніку міністра, дырэктару дэпартамента ці начальніку ўпраўлення ў МЗС, дэпутату парламента, паверанаму ў справах, саветніку-пасланніку або намесніку міністра, генеральнаму консулу адпавядае "*Запэўніванне ў высокай павазе*". Да начальніка аддзела МЗС, мэра горада, саветніка ці консула пішуць "*Запэўніванне ў глыбокай павазе*". Для параўнання, рускія эквіваленты трох узроўняў ветлівасці будуць адпаведна "*Заверение в весьма высоком уважении*", "*Заверение в высоком уважении*" і "*Заверение в глубоком уважении*".

У якасці **зваротаў** намі вылучаны: "*Паважаны(ая)... !*", "*Паважаныя ...!*", "*Паважаныя спадары!*", "*Спадары!*", "*Спадары і спадарыні!*", "*Сябры!*", "*Паважаныя калегі!*", "*Паважаныя студэнты!*", "*Алё!*".

**Запрашэнні**: "*Шчыра запрашаем!*", "*Сардэчна запрашаем!*", "*Калі ласка!*", "*Праходзьце, калі ласка!*".

**Падзякі** і адказы на падзяку: "*Вельмі прыемна!*", "*Дзякуй!*", "*Вялікі дзякуй!*", "*Дзякуй вялікі!*", "*Няма за што!*" , "*Калі ласка!*". Варта адзначыць, што пры апісанні семантыкі сітуацый ужывання пералічаных фразем неабходна ўлічваць іх узаемадапаўняльнасць і парнасць, якая можа мець строгі парадак. Напрыклад, у адказ на "*Дзякуй!*" звычайна гучыць "*Калі ласка!*" ці "*Няма за што!*". У адваротнай паслядоўнасці калі-нікалі можа сустракацца спачатку "*Калі ласка!*" і ў адказ "*Дзякуй!*", але ніколі – "*Няма за што!*" і "*Дзякуй!*".

**Пажаданні**: "*Прыемнага апетыту!*", "*Смачна есці!*", "*Будзь здаровы!*", "*Будзьце здаровы!*". Сюды ж мы адносім пакуль і **тосты**: "*За ваша здароўе!*", "*Будзьма!*".

**Віншаванні**: "*З Новым годам!*", "*З Раством!*", "*З Раством Хрыстовым!*", "*Хрыстос уваскрос!*", "*Сапраўды ўваскрос!*", "*З Днём нараджэння!*", "*З Днём народзінаў!*", "*Шчаслівых Калядаў!*", "*Вясёлых Калядаў!*".

**Загады**, **забароны**: "*Не курыць!*", "*Курыць забаронена!*", "*Па газонах не хадзіць!*", "*Паркоўка забаронена!*", "*Паркоўка асабістага аўтатранспарту забаронена!*". Адзначым, што ў

Бібліятэка БДУІР

адрозненне ад разгледжаных раней фразем, пералічаныя тут загады і забароны прадугледжаны ў іншай мадэлі камунікацыі, дзе адрасатам з'яўляецца жывы чалавек, але ў якасці адрасанта заўсёды выступае пісьмовы надпіс. Ніколі ў дадзеным выпадку не дазваляецца ўжываць прыведзеныя фраземы ў вуснай форме, бо гэта можа ўспрымацца як знявага да адрасату.

Тым не менш, у мове існуе шэраг **каманд**, якія маюць сваё выражэнне ў вуснай форме і не ўспрымаюцца непаважліва. Да больш пашыраных каманд належыць такая прагматэма, як "*Рукі дагары!*" (руская "*Руки вверх!*"). Яна выкарыстоўваецца ў прынцыпе любой узброенай асобай, якая праз наяўнасць зброі надзелена правам загадваць. А вось яшчэ адна вайсковая каманда: "*Зброю на плячо!*"(у рускай: "*На плечо!*"). Аднак апошні беларускі прыклад не з'яўляецца, наколькі нам вядома, зацверджаным паводле Статута і, тым болей, не ўжываецца ў войску ў рэчаіснасці. Варта адзначыць, што вайсковыя каманды адрозніваюцца асаблівай схільнасцю да кароткасці і лаканічнасці, і тлумачыцца гэта вельмі проста: ва ўмовах баявых дзеянняў ад аператыўнасці залежыць жыццё. Любая каманда павінна быць кароткай і максімальна простай для разумення. Для забеспячэння хуткасці рэакцыі на каманды выкарыстоўваюцца ўсе даступныя сродкі – у тым ліку і прасадычныя. Напрыклад, у прагматычна абумоўленай лексеме "*Напра-ВО!*" выдзяляецца, нараспеў вымаўляецца апошні склад, што надае рухам салдат патрэбны імпэт, адзначае пэўным чынам рытм выканання каманды. Паколькі акадэмічны пераклад вядзецца па рускай версіі Статута, то, на нашу думку, непазбежна з'явяцца калькі рускіх каманд, бо яны першымі ўзнікаюць у розуме білінгва. Яскравым прыкладам такіх перакладаў нам здаецца флоцкая каманда "*Аддаць швартовы!*", якая хутчэй нагадвае вымаўлены з беларускім акцэнтам рускі выраз "*Отдать швартовы!*". Магчыма, для пераходнага перыяду празмернае следаванне логіцы рускай мовы – з'ява не толькі непазбежная, але і ў нечым карысная. Людзям будзе нашмат прасцей засвоіць знаёмыя, пазнавальныя каманды ў арміі ці надпісы на дарожных знаках, чым нешта зусім новае, нібыта запазычанае з замежнай мовы.

Адзначым таксама, што ў судовай практыцы ў нас ужываецца руская мова, таму пакуль рана гаварыць пра беларускія эквіваленты выразаў кшталту "*Встать! Суд идет!*", "*Я протестую!*". Тое ж самае адбываецца і ў спорце, танцах, калі трэнер часта дае сігналы: "*На счет* [NUM] + [Vмн.л.,пр.ч.,законч.трыв.]", "*На старт!*", "*Внимание!*", "*Марш!*" [Расейска-беларускі, 2006].

Разгледзем зараз некалькі прыкладаў **інфармацыйных надпісаў**. Адразу папярэдзім, што гэты пункт утрымлівае некалькі тэматычных раздзелаў. Гэта сфера, дзе яскрава адлюстраваны стан неўраўнаважанай двухмоўнасці ў Беларусі. Канешне ж, калі нават збор правіл дарожнага руху дагэтуль не быў цалкам перакладзены на беларускую мову, то нядзіўна, што і на многіх дарожных знаках на сённяшні дзень пераважаюць рускія прагматэмы. Праўда, нам удалося знайсці такі прыклад, як: "*Акрамя аўтатранспарту* NGen" (МУС, напрыклад). Гэта, дарэчы, адзін з інтэрсеміятычных знакаў, бо выкарыстоўвае і іканічную выяву, і тэкст.

На інфармацыйных надпісах ў грамадскіх месцах беларуская мова больш ужывальна. Напрыклад амаль кожнаму вядомы наступныя **папярэджанні**: "*Працуем без выхадных*", "*Працуем штодзённа*", "*Аварыйны выхад*", "*Службовы ўваход*", "*Службовае памяшканне*", загады: "*Захоўвайце цішыню*", запрашэнні: "*Сардэчна (шчыра) запрашаем!*", прапановы: "*Лічыце грошы, не адыходзячы ад касы*".

Інфармацыйныя надпісы сустракаюцца таксама і **ў паліграфічнай прадукцыі**: "*Выдзелена намі*", "*Курсіў наш*".

Інфармацыйныя надпісы **на спажывецкіх таварах** утрымліваюць тэхнічную, прававую інфармацыю, інструкцыі: "*Усе правы абаронены*", "*Захоўваць пры тэмпературы (...) адноснай вільготнасці паветра не большай за (...)*", "*Дата вырабу (дата)*", "*Зроблена ў (краіна)*", "*Прыдатны да (дата)*". Відавочна, што дадзенае мноства прагматычных фразем мае пэўныя сінтаксічныя асаблівасці і варыяцыі, якія неабходна дакладна апісваць у адпаведных фармальных мадэлях.

У **транспарце** ўжываюцця пісьмовыя і вусныя прагматычныя фраземы. Пісьмовыя **паведамленні**: "*Няма ўваходу*", **забароны**: "*Не прыхіляцца*", "*Не прыхінацца*", **загады**: "*Не адцягвайце ўвагу вадзіцеля падчас руху*". Вусныя **папярэджанні**: "*Дзверы зачыняюцца!*", **паведамленні**: "*Наступны прыпынак ...*", "*Канцавая*", "*Канечны прыпынак*", **звароты**: "*Не забывайце аплачваць праезд*", "*Аплачаны праезд - гарантыя якасці транспартных паслуг*"; **папярэджанні** і **загады**: "*Поезд далей не ідзе - Калі ласка, пакіньце вагоны*".

Асобным чынам варта адзначыць існаванне прагматычных фразем у інтэрфэйсах камп'ютарных ці іншых тэхнічных сістэм. Гэта фраземы мадэлі камунікацыі "чалавек – машына". Тут маюцца на ўвазе фіксаваныя выразы, якія звязаны з вельмі канкрэтна акрэсленымі відамі працоўных сітуацый, дакладней кажучы, з аперацыямі, якія можна выконваць у рамках пэўнай сістэмы. У якасці прыкладаў такіх прагматэм можна прывесці наступныя: "*Захаваць як*", "*Новы файл*", "*Дастаць картку*".

Ступень выкарыстання беларускай мовы тут нізкая (за выключэннем беларускамоўных сайтаў (ці беларускамоўных версій сайтаў), банкаматаў, рэдкіх праграмных прадуктаў), але калі нейкі выраз увайшоў ва ўжытак моўнага калектыву (хай і нешматлікага, як гэта характэрна для беларускай мовы ў Беларусі), можна казаць пра прагматэму.



Бібліятэка БДУІР

### 2.3. Кампаненты фармальнай мадэлі апісання прагматэмы

Абагульняючы прыведзеныя вышэй апісанні прагматэм, выдзелім тыя ўласцівасці, якія неабходна ўлічваць дзеля іх фармалізацыі:

- Форма ўжывання: вусная ці пісьмовая
- Месца ўжывання
- Час ужывання (абсалютны ці адносны, з нагоды некаторай падзеі)
- Мэта ўжывання
- Характарыстыкі суб’ектаў камунікацыі: колькасць, адушаўлёнасць (чалавек ці надпіс), пол, узрост (абсалютны ці адносны), камунікатыўная роля (адрасант, адрасат)
- Сінтаксічныя асаблівасці
- Існаванне і характар сувязі с іншымі прагматэмамі (сінанімічнасць, супрацьлегласць, узаемная паслядоўнасць і інш.)
- Пазіцыя ў кантэксце (калі існуе, напрыклад, пачатак ліста ці афіцыйнага дакумента, завяршэнне размовы і г.д.)

## 3. Прыкладныя аспекты выкарыстання фармалізаванай семантыкі прагматэм беларускай мовы

У якасці прымяненняў класіфікацыі і фармалізаванага апісання прагматэм варта адзначыць наступныя:

- пераклад;
- камп’ютарная лінгвадыдактыка;
- семантычны пошук;
- стварэнне інтэлектуальных сістэм з моўным інтэрфейсам;
- аўтаматызацыя стварэння паралельных корпусаў тэкстаў;
- дапаўненне корпусаў тэкстаў прагматычнай інфармацыяй.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


**[Мельчук, 2006]** Мельчук И. А. Опыт теории лингвистических моделей «Смысл – Текст». Семантика, синтаксис / И. А. Мельчук. – Москва: Школа «Языки русской культуры», 1999. – 346 с.

**[Мельчук, 2007]** Мельчук И.А. Смысл и сочетаемость в словаре / Л.Н.Иорданская, И.А Мельчук. – Москва: Языки славянской культуры, 2007. – 672 с.

**[Расейска-беларускі, 2006]** Расейска-беларускі вайсковы слоўнік / пад рэд. П. Сцяцко. – Мінск: ТБМ, 1997. – 250 с.

**[Morgan, 2006]** Morgan J. L. Two Types of Convention in Indirect Speech Acts / J. L. Morgan // Syntax and Semantics vol. 9. – London: Academic Press, 1978. – pp. 261 – 280.


## FORMALIZATION OF THE SEMANTICS OF PRAGMATIC PHRASEMES OF THE BELARUSIAN LANGUAGE


Kim Y.A., Yeliseyeva O. E.

*Belarusian State University,*
*Minsk, Republic of Belarus*

**6rikim@gmail.com**

**olae@open.by**



Like any other type of idiomatic expressions, pragmatic phrasemes, or pragmatemes need to be translated as a whole, but in order to achieve that, they first need to be recognized as a whole. The problem is that many pragmatemes lack idiomaticity both on the morphosyntactic and semantic levels. Their semantics are nearly always represented by only one morphosyntactic representation. Although a new semantic and morphosyntactic representation can be constructed according to the rules of the language, it will not have the same effect in the given situation of usage. Therefore, it is the situation of usage that prescribes a particular morphosyntactic representation for the given semantic representation. In other terms, if we formalize the pragmatical component of these phrasemes, we can enable the machine to find adequate equivalents or provide more precise search results. The present article deals with pragmatemes in the Belarusian language and suggests a technique for describing the semantics of the situations in which pragmatemes are used. Such descriptions will serve as a start point for creating a knowledge base of the pragmatemes of the Belarusian language. A knowledge base, in its turn, can be applied in machine translation, semantic search and language learning systems, as well as in corpus linguistics.


Библиотека БГУИР